# У кніжнай скарбніцы стала больш скарбу

***17 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылася прэзентацыя інфармацыйных рэсурсаў выдавецтваў "K.G.Saur Verlag" (Германія) і "Wiley" (Вялікабрытанія).***

НББ ужо была знаёма з гэтымі двума сусветна вядомымі выдавецтвамі дзякуючы супрацоўніцтву з іх афіцыйнымі прадстаўнікамі на тэрыторыі краін СНД – ЗАТ "Мір–Дыялог" і ЗАТ "МК–Перыёдыка". Аднак шырокай прэзентацыі гэтых выдавецкіх гігантаў у Беларусі яшчэ не праводзілася, і супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі з цікавасцю заслухалі дзве лекцыі, прысвечаныя гісторыі і сённяшнім магчымасцям "K.G.Saur Verlag" і "Wiley".

Так, "K.G.Saur Verlag" было створана ў 1949 годзе ў Мюнхене і за кароткі час набыло трывалую вядомасць як адно з лепшых ва ўсім свеце выдавецтваў, якое выпускае біяграфічныя і бібліяграфічныя даведачныя выданні для бібліятэк. На сённяшні дзень у каталогу "K.G.Saur Verlag" больш за 2200 выданняў у друкаванай форме, на CD–ROM, DVD і on–line. Акрамя таго, "K.G.Saur Verlag" з'яўляецца афіцыйным выдаўцом матэрыялаў Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый (IFLA). У планах выдавецтва – выданні па мастацтву, музыцы, літаратуры, гісторыі, палітыцы, гуманітарных і сацыяльных навуках, бізнесу, бібліятэчнай справе і інфармацыйных навуках.

"Wiley" было заснавана ў 1807 годзе ў Нью–Йорку і ў пачатку сваёй дзейнасці спецыялізавалася на мастацкай літаратуры. Сёння ж яно вядома як адзін з сусветных лідэраў па выпуску навуковых, тэхнічных і медыцынскіх часопісаў, энцыклапедый, кніг, а таксама on–line прадукцыі і паслуг. Кампанія выпускае вучэбную, навуковую і навукова–папулярную літаратуру. У актыве выдавецтва каля 22700 назваў кніг, 400 назваў часопісаў (350 з якіх ствараюцца ў электроннай форме). "Wiley" мае выдавецкія цэнтры ў ЗША, Канадзе, Аўстраліі, многіх краінах Еўропы і Азіі.

Падчас прэзентацыі адбылася афіцыйная цырымонія дарэння Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі грамадска значнай інфармацыйнай прадукцыі "K.G.Saur Verlag" агульным коштам 10,5 тысячы еўра, а менавіта: біябібліяграфічнага паказальніка ў 10–ці тамах "Мастакі свету", Рускага біяграфічнага паказальніка ў 4–х тамах, Нямецкага біяграфічнага паказальніка ў 8–мі тамах, выданняў Міжнароднай федэрацыі бібліятэчных асацыяцый, Міжнароднага выдавецкага даведніка ISBN і інш. Як зазначыў падчас акцыі дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р.С.Матульскі, атрымліваць падарункі прыемна заўсёды, а ад такіх надзейных партнёраў, як ЗАТ "Мір–Дыялог" і, адпаведна, "K.G.Saur Verlag", – прыемна ўдвая. Цяпер новымі рэсурсамі змогуць скарыстацца дзесяткі тысяч чытачоў НББ.

**Мікола ЧЭМЕР.**